# RF - Stadler Minsk. Падтрымка ўстойлівасці.

Месцазнаходжанне:
Беларусь

Нумар праекта:
52092

Галіна:
Транспарт

Тып паведамлення:
Прыватнае

Экалагічная катэгорыя:
B

Дата зацвярджэння:
23 чэрвеня 2020 г.

Стан:
**Выплата**

Дата публікацыі рэзюмэ праекта на англійскай мове:
24 чэрвеня 2020 г.

*Згодна з пунктам 2.6 раздзела III Палітыкі доступу да інфармацыі, раскрыццё гэтага рэзюмэ праекта адкладзена ў адпаведнасці з пунктам 1.4.4 Дырэктывы аб доступе да інфармацыі.*

## Апісанне праекта

Выдача пазыкі ў 20 мільёнаў еўра на абаротныя сродкі для падтрымкі дзейнасці Stadler Minsk. Крэдыт ЕБРР дазволіць Stadler Minsk пераадолець цяжкасці, якія склаліся з прычыны ўздзеяння пандэміі Covid-19 на яе вытворчасць. Гэтыя сродкі будуць выкарыстоўвацца для падтрымкі вытворчасці па існуючых заказах на рухомы састаў і мінімізацыі парушэнняў паставак матэрыялаў.

*Гэты праект быў зацверджаны ў кантэксце рэагавання Банка на пандэмію COVID-19. Каб пазбегнуць затрымак з рэалізацыяй гэтага праекта, прэзідэнт Банка дазволіў адхіліцца ад звычайных тэрмінаў раскрыцця праекта, як гэта прадугледжана раздзелам V Дырэктывы аб доступе да інфармацыі. Падрабязную*

*інфармацыю аб рэагаванні Банка на COVID-19 і гэтым адхіленні можна знайсці на нашым сайце.*

## Мэты праекта

Прапанаваны механізм падтрымкі абаротных сродкаў дазволіць кампаніі своечасова выконваць замовы па кантрактах і захоўваць свае канкурэнтныя перавагі як надзейнага пастаўшчыка рухомага саставу ў рэгіёне.

## Уплыў на працэс пераходу

Ацэнка чаканага ўздзеяння на працэс пераходу ў балах: 85

Мэтавы паказчык уздзеяння на працэс пераходу (УПП) для гэтай аперацыі заключаецца ў захаванні параметраў, дасягнутых у рамках бягучага праекта са Stadler Minsk.

Парадак забеспячэння УПП для існуючага праекта быў сканцэнтраваны, у прыватнасці, на выпрацоўцы стандартаў карпаратыўнага кіравання і дзелавых паводзін (стварэнне савета дырэктараў), распаўсюджванні навыкаў, атрыманні сертыфікатаў па энергаэфектыўнасці, ахове навакольнага асяроддзя, ахове здароўя і бяспекі (у адпаведнасці з ISO 9001, ISO 14001 і OHSAS 18001) (належнае кіраванне якасцю), а таксама на пашырэнні рынку, на запуску пэўных вытворчых ліній (стварэнне навукова-практычнага цэнтраператваральнікаў) і на здольнасці кампаніі самастойна ўдзельнічаць у розных тэндарах (канкурэнтаздольная якасць).

## Інфармацыя пра кліента

ЗАТ «ШТАДЛЕР МІНСК» (STADLER MINSK)

ЗАТ «Штадлер Мінск» – даччыная кампанія Stadler Rail AG, швейцарскага вытворцы чыгуначнага рухомага саставу. Кампанія выраблае прыгарадныя і рэгіянальныя транспартныя цягнікі, лёгкія чыгуначныя машыны, цягнікі метро і трамваі. Stadler Rail абслугоўвае кліентаў па ўсім свеце.

## Фінансавая даведка ЕБРР

20 000 000,00 еўра

## Агульны кошт праекта

20 000 000,00 еўра

## Дапаўняльнасць

Рэагаванне на пандэмію COVID-19: фінансаванне ЕБРР дазваляе эфектыўна пераадольваць разрыў у ліквіднасці з-за несприяльнай кан'юнктуры рынку, напрыклад з нагоды пандэміі COVID-19.

Банк выкарыстоўвае падыход павялічанай дапаўняльнасці пры адсутнасці тэрміновага капіталу камерцыйнага банка, абмежаванні якога непасрэдна не звязаны са здольнасцю Кампаніі атрымліваць такое фінансаванне. У цяперашні час фінансаванне спонсара накіравана на крытычныя патрэбы ў абаротных сродках па ўсёй групе. Здольнасць Банка хутка рэагаваць на патрэбы кліента таксама з'яўляецца адным з асноўных элементаў дапаўняльнасці.

## Экалагічная і сацыяльная даведка

Праект адносіцца да катэгорыі В (Экалагічная і сацыяльная палітыка 2019 г.)  Кліент доўгі час карыстаецца паслугамі Банка. Такім чынам, Экалагічная і сацыяльная комплексная праверка (ЭСКП) была выканана на аснове агляду апошніх экалагічных і сацыяльных (ЭС) справаздач (май 2019 г.), апошніх штогадовых экалагічных і сацыяльных справаздач (ШЭСС) і абноўленых карпаратыўных анкет па экалагічных і сацыяльных (ЭС) пытаннях і пытаннях COVID-19.

На сённяшні дзень кампанія прадэманстравала добрыя паказчыкі па экалагічных і сацыяльных пытаннях і ў значнай ступені рэалізавала ўзгоднены План экалагічных і сацыяльных мерапрыемстваў (ПЭСМ). Кампанія правяла сертыфікацыю сістэм менеджменту якасці, аховы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і бяспекі адпаведна стандартам ISO 9001, ISO 45001 і ISO 14001. Дзейнічаюць правілы кіравання падрадчыкамі, а параметры аховы навакольнага асяроддзя і аховы працы ўключаны ў крытэрыі выбару падрадчыкаў. Усе супрацоўнікі маюць пісьмовую працоўную дамову. Умовы працы і ўзнагароджанне вызначаюцца шэрагам унутраных правілаў (якія ахопліваюць месца працы, заработную плату, прэміі, гарантыі і сацыяльныя выплаты). У кампаніі дзейнічае працэдура разгляду скаргаў для збору і разгляду скаргаў і прапаноў супрацоўнікаў, уключаючы ананімныя скаргі.

Кампанія мае ўсе неабходныя экалагічныя дазволы і кантракты са спецыялізаванымі кампаніямі на збор, апрацоўку, утылізацыю і перапрацоўку адходаў. Неабходна палепшыць зоны часовага збору адходаў і захоўвання лакафарбавых матэрыялаў. Гэтае пытанне павінна быць вырашана, калі пачне працаваць новая малярная майстэрня з дадатковым складам фарбаў і лакаў.

Кампанія мае надзейныя механізмы пажарнай бяспекі. План гатоўнасці да надзвычайных сітуацый дзейнічае і пераглядаецца штогод. Трэнінгі па пажарнай бяспецы для ўсіх супрацоўнікаў і наведвальнікаў праводзяцца падчас правядзення інструктажу па тэхніцы бяспекі, і ў далейшым перыядычна, для ўсіх супрацоўнікаў на працоўных месцах.

ЭСКП выявіла, што кампанія мае надзейны план забеспячэння бесперапыннасці бізнесу і выконвае строгія працэдуры, звязаныя з стрымліваннем пандэміі

COVID, у адпаведнасці з нормамі СААЗ і карпаратыўнымі правіламі. Сітуацыя, звязаная з абмежаваннямі COVID, якая склалася зараз, не акажа негатыўнага ўздзеяння на рэалізацыю ўзгодненага раней ПЭСМ і на агульнае выкананне экалагічных і сацыяльных патрабаванняў ЕБРР. Кампанія мае неабходныя рэсурсы для забеспячэння аховы здароўя і бяспекі, і не будзе праводзіць скарачэння персаналу. Банк будзе сачыць за выкананнем Кампаніяй сваіх экалагічных і сацыяльных абавязацельстваў.

## Тэхнічнае супрацоўніцтва і фінансаванне грантаў

Не прадугледжана.

## Кантактная асоба ў кампаніі

Міхаіл Шумскі
Mikhail.Shumski@stadlerrail.com
+375 1716 22 953
www.stadlerrail.com
ЗАТ «Штадлер Мінск», вул. Завадская, 47, 222750 Рэспубліка Беларусь, Дзяржынскі раён, Мінская вобласць, г. Фаніпаль

## Апошняе абнаўленне рэзюмэ праекта

7 снежня 2020 г.

## Дадатковыя матэрыялы

- Пераклад: RF - Stadler Minsk. Падтрымка ўстойлівасці (руская мова)
  Тып: PDF, дата публікацыі: 29.07.2020, мова: руская

## Рамачны праект

- Framework: Resilience Framework
  Апублікавана: 05.11.2020

## Разуменне пераходу

Дадатковая інфармацыя адносна стаўлення ЕБРР да вымярэння вынікаў пераходу даступная тут.

## Магчымасці для бізнесу

Каб даведацца пра магчымасці для бізнесу або закупкі, звяжыцеся з кампаніяй-кліентам.

Каб даведацца пра магчымасці наладзіць камерцыйную дзейнасць з ЕБРР (не звязаную з закупкамі),

пазваніце па тэлефоне +44 20 7338 7168
або напішыце на адрас электроннай пошты projectenquiries@ebrd.com.
Наконт праектаў дзяржаўнага сектара звярніцеся ў Аддзел закупак ЕБРР:
Тэл.: +44 20 7338 6794
Адрас электроннай пошты: procurement@ebrd.com

## Агульныя запыты

Канкрэтныя запыты можна зрабіць з дапамогай Формы запытаў ЕБРР.

# Экалагічная і сацыяльная палітыка (ESP)

ESP і адпаведныя Патрабаванні да рэалізацыі праектаў (PR) вызначаюць шляхі, якімі ЕБРР выконвае свае абавязацельствы па прапагандзе «экалагічна бяспечнага і ўстойлівага развіцця». ESP і PR прадугледжваюць канкрэтныя палажэнні аб абавязковым выкананні кліентамі патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства аб інфармаванні грамадскасці і правядзенні кансультацый з ёй, а таксама аб стварэнні механізма падачы і разгляду скаргаў, які дазволіць атрымліваць скаргі ад зацікаўленых бакоў і будзе садзейнічаць вырашэнню апісаных у іх праблем, у прыватнасці, якія тычацца экалагічнага і сацыяльнага значэння праекта і дзейнасці кліента. У залежнасці ад характару і маштабу экалагічных і сацыяльных рызык і наступстваў праекта ЕБРР таксама патрабуе ад сваіх кліентаў пры неабходнасці раскрываць інфармацыю пра такія рызыкі і наступствы іх праектаў альбо праводзіць змястоўныя кансультацыі з зацікаўленымі бакамі, разглядаць іх звароты і адказваць на іх.

Больш падрабязна пра тое, як арганізавана работа ЕБРР у гэтым напрамку, можна даведацца ў ESP.

# Прафесійная этыка і кантроль за адпаведнасцю нарматыўна-прававым патрабаванням

Упраўленне начальніка кантролю за адпаведнасцю нарматыўна-прававым патрабаванням (OCCO) ЕБРР прасоўвае прынцыпы належнага кіравання і забяспечвае прымяненне самых высокіх стандартаў прафесійнай этыкі ва ўсіх відах дзейнасці Банка ў адпаведнасці з найлепшымі міжнароднымі практыкамі. Комплексная экспертыза добранадзейнасці праводзіцца ў дачыненні да ўсіх кліентаў Банка, каб гарантаваць, што праекты не нясуць недапушчальна вялікай рызыкі для рэпутацыі Банка. Банк лічыць, што выяўленне і вырашэнне праблем яшчэ на стадыі зацверджання праекта з'яўляецца найбольш эфектыўным сродкам забеспячэння законнасці банкаўскіх аперацый. OCCO іграе ключавую ролю ў гэтых прафілактычных мерапрыемствах, а таксама дапамагае адсочваць рэпутацыйную рызыку, якую нясуць у сабе праекты, пасля размяшчэння капіталу.

OCCO таксама нясе адказнасць за расследаванне абвінавачванняў у махлярстве, карупцыі і неправамерных дзеяннях падчас рэалізацыі праектаў, якія фінансуе ЕБРР. Любая асоба, як супрацоўнік Банка, так і трэці бок, якая мае падазрэнні ў махлярстве ці карупцыі, павінна даслаць начальніку кантролю за адпаведнасцю нарматыўна-прававым патрабаванням пісьмовую справаздачу на адрас электроннай пошты compliance@ebrd.com. OCCO разглядзіць усе атрыманыя паведамленні, у тым ліку ананімныя, і прыме адпаведныя захады. Справаздачы могуць быць складзеныя на любой мове Банка альбо краін, дзе дзейнічае Банк. Прадстаўленая інфармацыя павінна быць абгрунтаванай.

## Палітыка доступу да інфармацыі (AIP)

У AIP, якая ўступіць у сілу 1 студзеня 2020 года, выкладзена, якім чынам ЕБРР раскрывае інфармацыю сваім зацікаўленым бакам і праводзіць з імі кансультацыі з мэтай павышэння дасведчанасці аб сваіх стратэгіях, палітыках і аперацыях і пашырэння іх правільнага разумення. Наведайце раздзел «Палітыка доступу да інфармацыі», каб азнаёміцца з інфармацыяй па гэтым пытанні, якая даступная на сайце ЕБРР на сённяшні дзень.

Банку можна адправіць запыт аб атрыманні інфармацыі праз Форму запыту ЕБРР.

## Незалежны орган падсправаздачнасці па праектах (IPAM)

Калі намаганні Кліента або Банка па рашэнні экалагічных, сацыяльных праблем або праблем, звязаных з публічным раскрыццём інфармацыі, не мелі плёну (напрыклад, праз механізм разгляду скаргаў Кліента на ўзроўні праекта або праз прамое ўзаемадзеянне з кіраўніцтвам Банка), некаторыя асобы і арганізацыі могуць паспрабаваць вырашыць свае праблемы з дапамогай Незалежнага органа падсправаздачнасці па праектах (IPAM) ЕБРР.

IPAM незалежна разглядае праблемы Праекта, якія, як мяркуецца, нанеслі (або могуць нанесці) шкоду. Мэтамі Органа з'яўляюцца: падтрымка дыялогу паміж зацікаўленымі бакамі для вырашэння экалагічных, сацыяльных праблем і праблем, звязаных з публічным раскрыццём інфармацыі; вызначэнне выканання Банкам Экалагічнай і сацыяльнай палітыкі ці палажэнняў Палітыкі доступу да інфармацыі, якія тычацца канкрэтных праектаў; дзе гэта дастасавальна, ліквідацыя любога існуючага невыканання гэтых палітык з адначасовым прадухіленнем невыканання палітык Банкам у будучыні.

Наведайце вэб-старонку Незалежнага органа падсправаздачнасці па праектах, каб даведацца, як падаць запыт на разгляд праз нашу канфідэнцыяльную анлайн-форму, па электроннай пошце, звычайнай пошце ці па тэлефоне. IPAM гатовы абмеркаваць вашы праблемы і адказаць на любыя пытанні, якія могуць у

вас узнікнуць адносна падачы або апрацоўкі Запытаў, якія адпавядаюць Палітыцы і Дапаможніку па падсправаздачнасці па праектах. Па запыце асоба заяўніка можа заставацца канфідэнцыяльнай.